**Тухта, В.** На горнай заставе Лянгар... / Валерый Тухта // Лепельскі край. — 2022. — 15 лют. — С. 3.

# НА ГОРНАЙ ЗАСТАВЕ ЛЯНГАР...

**На аматарскім фотаздымку – выпускнікі Слабадской сярэдняй школы Генадзь Закрэўскі, Васіль Вашкевіч і Віктар Пшонка. Сустрэча хлопцаў адбылася ў роднай школе вясной 1988 года, куды яны завіталі па запрашэнні настаўнікаў. Незадоўга да той сустрэчы, не па сезоне загарэлы, з войска вярнуўся Васіль Вашкевіч. Большая частка службы яго, як і таварышаў, праходзіла ў замежнай камандзіроўцы ў Афганістане, дзе яны выконвалі інтэрнацыянальны абавязак.**



**Генадзь Закрэўскі, Васіль Вашкевіч і Віктар Пшонка**

Васіль Вашкевіч і Віктар Пшонка – аднавяскоўцы, нарадзіліся ў невялікай вёсцы Вілы. З розніцай у паўгода былі прызваныя на тэрміновую службу ў 103-ю Віцебскую паветрана-дэсантную дывізію. У Афганістане большую частку службы Віктар правёў на горнай заставе ў наваколлях афганскай сталіцы. Па горных дарогах, якія на кожным кроку таілі ў сабе небяспеку, Васіль аб’ехаў амаль усю краіну.

Генадзь Закрэўскі – сапраўдны сябар і аднакласнік Віктара Пшонкі, родам са Слабады. З 2-га курса Лепельскага гідрамеліярацыйнага тэхнікума, восенню 1985 года, Віктара і Генадзя прызвалі ў войска. Генадзя, які разам з сябрам марыў стаць дэсантнікам, адабралі для службы ў пагранічныя войскі. Пасля навучання хлопец служыў на горнай заставе Лянгар, на мяжы з Афганістанам. У складзе мотаманеўровай групы неаднаразова даводзілася бываць «за рэчкай».

Тэкст и фота: **Валерый Тухта**